Прайсці праз вернасць



Максім Танк – адзін з самых вядомых і арыгінальных прадстаўнікоў беларускай культуры і паэзіі XX стагоддзя, які вельмі шмат зрабіў для яе ўзбагачэння і развіцця, для пошукаў новых шляхоў паэтычнай творчасці.

Паэт – бунтар, паэт – патрыёт, паэт – сатырык, паэт – філосаф, паэт – наватар…

Яму суджана было з'явіцца і на поўны голас загаварыць у адну з самых буйных нацыянальна-вызваленчых эпох, калі надзвычай востра паўстала пытанне – быць ці ня быць народу Заходняй Беларусі і ўсяму беларускаму народу з яго самабытнасцю, культурай, мовай, з яго гістарычнай спадчынай.



Творчасць Максіма Танка – выдатная з'ява ў свеце сучаснай еўрапейскай літаратуры.



Напоўненыя глыбокім філасофска-аналітычным асэнсаваннем жыцця і чалавека, высокім гуманістычным зместам і грамадзянска-патрыятычным пафасам, яго творы шырока раскрылі асаблівасці нацыянальнага характару, гістарычнага шляху і лёсу беларускага народа, выявілі багацце і шматстайнасць яго гісторыі і культуры, вялікія патэнцыяльныя магчымасці мовы.



Сэнс сваёй паэзіі М. Танк бачыць у цеснай еднасці з жыццём людзей працы, з сённяшнім жыццём, трывожным і неспакойным.

У вершах М. Танка ёсць прастата, высокая духоўнасць і неаслабная ўвага да людзей, да свету, да таго, пра што ён піша. Здавалася б, напісана некалькі радкоў, а ў іх – вопыт, скандэнсаванасць думак цэлых пакаленняў.
Творчасць М. Танка не з`яўляецца гісторыяй ці ўспамінам пра мінулае. У ёй – будучыня, дзе жыве творчая, вечная душа – лірыка.



Імем Максіма Танка названы Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт у 1995 г.

Імем Максіма Танка названы
Мінскі педагагічны каледж,
вуліца ў Мінску,
Мядзельская раённая бібліятэка.

Нацыянальны банк Беларусі
29 жніўня 2013 г. ўвёў у абарачэнне памятную манету «Максім Танк. 100 гадоў»



5 снежня 2014 г. у Мядзеле адкрылі першы ў Беларусі помнік Максіму Танку





Танк, М.

Пад мачтай : паэзія / М. Танк. – Вільня : [Выд. Р. Шырмы], 1938. – 110 с.




Танк, М.

Вастрыце зброю : [вершы, паэмы] / М. Танк ; рэд. М. Клімковіч. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1945. – 131 с.



Танк, М.

Праз вогненны небасхіл / М. Танк ; пад рэд. М. Клімковіч. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1945. – 224 с.



Танк, М.

Нарач / М. Танк ; [рэд. Н. Татур]. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1947. – 109 с.



Танк, М.

Чтоб ведали : стихи / М. Танк ; [ред. В. Максимова]. – Минск : Гослитиздат, 1949. – 129 с.



Танк, М.

У дарозе / М. Танк. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1954. – 24 с.



Танк, М.

Збор твораў : у 4 т. / М. Танк. – Мінск : Беларусь, 1954–1964. – Т. 3 : След бліскавіцы. Мой хлеб надзенны. Глыток вады. – 1957. – 557 с.



Танк, М.

Ключ жураўліны. Лірыка / М. Танк. – Мінск : Беларусь, 1971. – 496 с.

У аднатомнік народнага паэта Беларусі Максіма Танка ўвайшлі лепшыя лірычныя творы са шматлікіх яго паэтычных зборніках.



Танк, М.

Хай будзе святло : вершы / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1972. – 312 с.


Глыбінеў думкі, лірічнасцю і ўсхваляванасцю вызначаюцца вершы аб роднай зямлі, аб лёсе міру, аб паэзіі натхненай працы, аб чысціні чалавечых пачуццяў.



Танк, М.

Дарога, закалыханая жытам : вершы / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1976. – 208 с.

У кнігу ўвайшлі вершы аб партыі, Радзіме, аб працоўных здзяйсненнях сучаснікаў.



Танк, М.

Збор твораў : у 6 т. / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1978–1981. – Т. 6 : Дзеннікі ; літаратурна-крытычныя артыкулы. – 1981. – 637 с.

У шосты том Збору твораў ўвайшлі дзеннікі 1935–1939 гг., а таксама літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы.



Калеснік, У.


Максім Танк. Нарыс жыцця і творчасці / У. Калеснік. – Мінск : Маст. літ., 1981. – 189 с.

У кнізе разглядаецца жыццевы і творчы шлях народнага паэта Беларусі, аналізуюцца многія вершы і паэмы, даследуецца паэтычнае майстэрства.



Танк, М.

На этапах : вершы / М. Танк ; уступ. арт. Р. Баравога ; выд. В. Труцькі. – Мінск : Маст. літ., 1983. – 127 с.



Танк, М.


За маім сталом : вершы / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1984. – 175 с.

Паэзія народнага паэта Беларусі сугучна праявам сацыялістычнай Бацькаўшчыны. Самыя запаветныя чалавечыя пачуцці сагрэты думкай і душой паэта.



Танк, М.

Збор калосся : вершы (1983–1988) / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 301 с.



Танк, М.

Выбранае : вершы / М. Танк ; прадм. В. Зуенка. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 335 с.

Вершы народнага паэта Беларусі здзіўляюць багаццем тэм, вобразаў, разнастайнасцю мастацкіх форм, імкненняў ахапіць усю складанасць жыцця.



Танк, М.


Мне пару крыл дало юнацтва…: выбр. ліріка / М. Танк ; уклад. В. Рагойшы. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 479 с.

У кнігу ўвайшлі ўзоры яго грамадзянскай, пейзажнай і філасофскай лірыкі, а таксама асобныя сатырычныя вершы.




Танкаўскія чытанні «Максім Танк і сучасны літаратурны працэс» : рэсп. навук.-практ. канф., 17–18 верас. 2002 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: Я. А. Гарадніцкі, А. І. Лугоўскі, М. Ф. Шаўлоўская. – Мінск : БДПУ, 2003. – 84 с.

У матэрыялах канферэнцыі асэнсоўваецца самабытнасць мастацка-філасоўскага свету, вобразна-асацыятыўнага мыслення М. Танка, прасочваецца шматграннасць сувязяў паэта з фальклорнымі і літаратурнымі традыцыямі.



Пятыя Танкаўскія чытанні : матэрыялы навук.-практ. канф., прысвечанай 10-годдзю з дня надання Беларус. дзярж. пед. ун-ту імя Максіма Танка, 10 кастр. 2005 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А. І. Лугоўскі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2005. – 82 с.



Танк, М.

Збор твораў : у 13 т. / М. Танк ; рэд. В. П. Рагойша. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – Т. 3 : Вершы (1954–1964). – 447 с.

Асобны раздзел склалі творы, не уведзеныя аўтарам у кніжныя выданні.



Танк, М.

Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 5 : Вершы (1972–1982). – 448 с.

Асобны раздзел утвараюць вершы, якія публікаваліся толькі ў газетах або захаваліся ў рукапісах.



Шостыя Танкаўскія чытанні : да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа і 95-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А. І. Лугоўскі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2008. – 248 с.



Сёмыя Танкаўскія чытанні : да 95-годдзя БДПУ імя М. Танка : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: Г. Я. Адамовіч [і інш.] ; адк. рэд. Ф. С. Шумчык. – Мінск : БДПУ, 2010. – 292 с.




Танк, М.


Збор твораў : у 13 т. / М. Танк ; уклад.: У. І. Мархель, С. У. Калядка ; рэд. А. У. Бразгуноў. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – Т. 12 : Лісты. – 942 с.



Максім Танк у дыялогу славянскіх літаратур: традыцыі, наватарства, нацыянальная адметнасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння акадэміка НАН Беларусі, лаўрэата Ленінскай прэміі СССР і Дзярж. прэмій СССР і БССР М. Танка, Мінск, 17–18 верас. 2012 г. / рэдкал.: Я. А. Гарадніцкі, С. У. Калядка. – Мінск : Права і эканоміка, 2012. – 209 с.




Восьмыя Танкаўскія чытанні : (да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка) : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 13–14 верас. 2012 г. / рэдкал.: В. Д. Старычонак (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2012. – 224 с.



Мікуліч, М.

Максім Танк. Талент, заручаны з небам / М. Мікуліч. – Мінск : Літ. і мастацтва, 2012. – 336 с.

Даследуецца жыццё і творчасць М. Танка як грамадска-культурнага феномена, аднаго з самых магутных і яркіх талентаў ў гісторыі беларускай літаратуры.



Дзявятыя Танкаўскія чытанні : (да 100-годдзя ўніверсітэта) : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 26 верас. 2014 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. Д. Старычонак (адк. рэд.), І. М. Гоўдзіч, Н. В. Заяц. – Мінск : БДПУ, 2014. – 300 с.



Калядка, С. У.

Максім Танк : новыя факты, матэрыялы, інтэрпрэтацыі / С. У. Калядка ; пад навук. рэд. А. Л. Верабей, Л. К. Кісялёва. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 485 с.



Дзясятыя Танкаўскія чытанні : (да Года культуры ў Беларусі) : зб. навук. арт. : [матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 16 верас. 2016 г.] / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. Д. Старычонак (адк. рэд.), І. М. Гоўдзіч, Н. В. Заяц. – Мінск : БДПУ, 2016. – 424 с.